# Пытаньні

Прэзыдэнт ня часта бывае госьцем на нашай зямлі. Тым большая падзея, калі ён сюды прыяжджае, ды яшчэ разам з прэм'ер–міністрам. Як заўважыў сам спадар прэзыдэнт, пэўна ж, у сьвеце такога не было, каб дзьве такія высокія асобы адкрывалі ўрачыста ачышчальню сьцёкаў у такім мястэчку, як наша Гайнаўка.

Апошнім акцэнтам прэзыдэнцкага візыту была сустрэча з прадстаўнікамі беластоцкіх сродкаў масавай інфармацыі ў радыё "Беласток". Хто слухаў перадачу са студыі "Рэмбрант", той мог пераканацца, які ўзровень беластоцкай журналістыкі. Некалькі пытаньняў вычарпала вынаходлівасьць супрацоўнікаў мясцовых сродкаў масавай інфармацыі. Дарма сам прэзыдэнт пытаўся: "Ці ёсьць яшчэ пытаньні? Пан? Не? А можа пані? Таксама не? Дык я нешта яшчэ скажу". Пытаньні абарваліся на тым, як адзін з журналістаў пацікавіўся, што прэзыдэнт думае пра стан польскага футболу. Каб ня Лех Пілярскі з радыё і ягоныя пытаньні, сустрэча ператварылася б у вымушаны прэзыдэнцкі маналёг.

Чытачы "Нівы" пэўна ж запытаюць, чаму я не паставіў спадару прэзыдэнту нейкага пытаньня, калі я такі разумны. Было ж пра што пытацца: пра стан беларускай нацыянальнай меншасьці, пра польска–беларускія ўзаемадачыненьні ды стасункі з прэзыдэнтам Лукашэнкам у прыватнасьці.

Не паставіў я ніякага пытаньня, бо ні мяне, ні нікога з маіх калегаў зь "Нівы" і "*Czasopisu*" на сустрэчу не запрасілі. Таксама, дарэчы, як на ўвесь візыт. А кажуць, што прэзыдэнт прыехаў да беларусаў.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1997. 14 верасьня. № 37. С. 3.